ныя ў нас кнігі, як "Гісторыя літоўскага народа" Тэадора Нарбута, "Апісанне Барысаўскага павета" Яўстаха Тышкевіча, "Беларускія старажытнасці" Аляксандра Семянтоўскага, "Вілія і яе берагі" Канстанціна Тышкевіча, "Віцебская Беларусь" Мікалая Нікіфароўскага, "Беларускі зборнік" Еўдакіма Раманава, "Смаленскі этнаграфічны зборнік" Уладзіміра Дабравольскага, "Беларусы" Яўхіма Карскага, "Віцебская старына" Аляксея Сапунова, "Славянскае жыллё ў паўночна-заходнім краі" Аляксея Харузіна, "Беларускі народ" Міхала Федароўскага, "Беларусы-палешукі" Аляксандра Сержпутоўскага, "Беларусы-сакуны" Ісака Сербава, "Народная культура славян" Казіміра Машынскага, "Рэчыцкае Палессе" Чэслава Пяткевіча, "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі" Вацлава Ластоўскага, працы Зарыяна Даленгі-Ходакоўскага, Рамуальда Зянькевіча, Міхала Балінскага, Адама Кіркора, Івана Насовіча, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Адама Багдановіча, Міхаіла Без-Карніловіча, Браніслава Тарашкевіча, Міколы Шчакаціхіна, Усевалада Ігнатоўскага, Мікалая Улашчыка, Рыгора Шырмы, Фёдара Янкоўскага і многіх іншых выдатных дзеячаў нашай культуры.

Такое маштабнае, шматтомнае выданне разлічана не на год і не на два — на дзесяцігоддзі. Той, хто пачне набываць кнігі "Беларускага кнігазбору" (пра іх выхад мы будзем шырока інфармаваць насельніцтва), з часам стане ўладальнікам вялікага, неацэннага скарбу, самага дарагога сямейнага набытку, што будзе перадавацца з пакалення ў пакаленне. Выданне "Беларускі кнігазбор" задумана як своеасаблівы дамашні універсітэт беларусазнаўства. Без яго не абыдзецца ніводзін грамадзянін Беларусі, які хоча быць па-сапраўднаму адукаваным культурным чалавекам.

Першы том "Беларускага кнігазбору" выйшаў ужо з друку і адразу звярнуў на сябе ўвагу чытача. Гэта — "Выбраныя творы" Яна Чачота, пачынальніка новай беларускай літаратуры, чые 200-я ўгодкі адзначала сёлета наша грамадскасць.

## "Ковчег": опыт издания некоммерческой сериальной литературы

*Юрий ЦЫБИН, генеральный директор фирмы "Ковчег"*

Издание художественной литературы не является основным направлением деятельности рекламно-издательской фирмы "Ковчег". Тем не менее практически с момента ее создания (1990 г.) фирма реализует ряд проектов, связанных с некоммерческим книгоизданием. Один из них, осуществляемый вот уже на протяжении шести лет, — издание поэтической серии "Ковчег".

Поэтическая книжная серия "Ковчег" — одно из немногих серийных изданий, затеянных исключительно на энтузиазме ее создателей с целью популяризации творчества местных авторов. За пять лет существования на конкурсной основе выпущено восемь книжек, семь из которых являются дебютными сборниками авторов (два сборника были выпущены вне рамок серии совместно с другими издательствами). Книжки серии не остались не замеченными ни читателями, ни критиками: через Национальную библиотеку на выпуски серии подписались около двух десятков ведущих библиотек разных стран мира. "Ковчеговские" сборники занимали высокие места в рейтингах белорусских изданий, публикуемых Книжной палатой в газете "Советская Белоруссия", были отмечены газетой "Книжное обозрение". Выпущенный в рамках серии сборник стихов Адама Глобуса "Скрыжаванне", по сведениям газеты "Наша Ніва",



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

польская критика назвала лучшей книгой белорусской поэзии текущего десятилетия. В серии издаются книги как русскоязычных поэтов (Дмитрий Строцев, Феликс Аксёнцев, Елена Казанцева, Юрий Цыбин), так и поэтов, пишущих на белорусском языке (Тацціяна Сапач, Адам Глобус, сборник текстов “Беларускі рок-н-рол”).Выпущена также книга проживающего в Канаде минского барда Марка Мермана.

Все сборники, вошедшие в серию, изданы тиражом 3000 экземпляров. Часть из них была реализована через библиотечную систему страны, часть была отдана в розничную продажу. К сожалению, торговля до сих пор не заинтересована в продаже некоммерческой литературы, поэтому с неохотой берет на реализацию подобные издания. Однако опыт продажи книг “ковчеговской” серии через книжные магазины показал, что на эту литературу имеется устойчивый спрос.

Опыт издания поэтической серии показал, что даже в условиях нестабилизированной экономики возможно осуществлять проекты, нацеленные на развитие культурного слоя страны. Не ставя перед собой цели добиться коммерческого успеха, издатели активно искали партнеров, готовых поддержать идею существования независимой поэтической серии. В разные годы в финансировании проекта участвовали молодежный центр “Ориентир” и Белорусское общество “Книга”, “Беларуская Асацыяцыя Студэнтаў” (Белосток) и фирма “Класс-клуб”. К оформлению книжек привлекались нестандартно мыслящие минские художники Андрей Дорохин, Адам Глобус, Лявон Вольский и Владимир Цеслер. В результате серия обрела свое “лицо” не только в содержательной своей части, но и во внешнем оформлении.

Кроме того, творчество авторов “ковчеговской” серии было представлено и в звуковом варианте — на выпущенных “Ковчегом” авторских кассетах Е. Казанцевой и М. Мермана, кассетах с песнями на слова Ф. Аксёнцева, Т. Сапач, А. Глобуса и других авторов в исполнении белорусских музыкантов.

С развитием материальной базы и открытием собственной типографии “Ковчег” приступил к реализации нового проекта — изданию информационных и нотных сборников белорусских композиторов; в частности, увидели свет книги Ольги Дадиомовой “Осип Козловский. 1757—1851”, нотные сборники Нила Гилевича и Евгения Поплавского, книга Гая де Пикарда “Царкоўная музыка на Беларусі. 989—1995” и другие.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Выдавецкая дзейнасць Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады

*Алег ТРУСАЎ, канд. гіст. навук, дэкан факультэта інфармацыйна-бібліятэчных сістэм Беларускага універсітэта культуры;*

*Віталь СКАЛАБАН, канд. гіст. навук, намеснік дырэктара БелНДІ дакументазнаўства, археаграфіі і архіўнай справы*

Доўгі час з'яўленне і дзейнасць на пачатку XX ст. адной з самых першых і ўплывовых беларускіх партый — Беларускай Сацыялістычнай Грамады — замоўчвалася і фальсіфікавалася савецкімі беларускімі гісторыкамі. Аднак у канцы 80-х гадоў пад уплывам палітычных зменаў у беларускае грамадства пастулова пачалі вяртацца ідэі і думкі, выказаныя заснавальнікамі Грамады, а таксама вяртацца з нябыту іх імёны і біяграфіі. У гэтым часе з'явіліся людзі, якія засведчылі не толькі